ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ЧАЦВЕР
15 чэрвеня
№ 10—11 (1727—1728)
1995 года

● Я МЯРКУЮ

## «Правільна пісаць — справа гонару прафесійнага журналіста»

*Вядомая справа — к чацвёртаму курсу на лекцыі ўжо можна хадзіць не так актыўна. А можна зусім не хадзіць. Семінары ж наведваць выключна дзеля жадання пабачыць увесь курс, пасля чаго — цяпнуць піўка. Або яшчэ чаго-небудзь. Нехта ўжо працуе, нехта ўладкоўваецца, нехта лічыць, што ўжо ўсё ведае. Словам, карыстаючыся армейскай тэрміналогіяй, «дзяды». Зрэшты, часам, насуперак занятасці і гэтай даволі натуральнай саманадзейнасці, «дзяды» ходзяць на ўсе лекцыі.*

*У ліку тых прадметаў, заняткі па якіх наведвае большасць студэнтаў 4-га курса факультэта журналістыкі, ёсць прадмет «Літаратурнае рэдагаванне». Чытае яго Марыя Пятроўна Карповіч, дацэнт кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання.*

*Ніжэй мы прапануем некалькі розных думак студэнтаў, якія заканчваюць сёлета курс літаратурнага рэдагавання.*

**Вольга ХАДАРЭНКА.**

«Хто стане спрачацца з тым, што для журналіста важна добра пісаць?.. Але для гэтага мала толькі ведаць правілы. Уменне своечасова і дарэчна іх прымяніць, пазбегнуць памылак — вось складнікі добрага журналісцкага тэкста. Уменню быць рэдактарам самога сябе і навучае М. П. Карповіч сваіх студэнтаў на занятках па літаратурнаму рэдагаванню».

* * *

**Васіль ДОБРУШ:**

«Дзякуючы рэдагаванню я стаў больш уважліва ўчытвацца ва ўжо напісаны тэкст. Аднак нашмат складаней правіць сябе, чым іншых, таму што «прызвычайваешся» да словаў, і памылкі становяцца незаўважнымі. Каб гэтага не адбывалася, тэкст трэба адкладаць на некалькі дзён і потым зноў перачытваць. Пры аператыўнай журналісцкай рабоце гэта практычна немагчыма, і застаецца спадзявацца на карэктара».

* * *

**Дзяніс ДЗЯМЧЭНКА:**

«Заняткі па літаратурнаму рэдагаванню рэдка калі пакідаюць абыякавым: яны альбо падабаюцца, альбо не. Прычым негатыўныя адносіны бываюць выкліканы хутчэй атмасферай лекцый, пры якой кожны ўцягнуты ў працэс навучання. Пры такіх цесных стасунках не вывучыць прадмет немагчыма.

Асабіста я далучаюся да тых, каму гэты прадмет па душы. Па-першае, мяне вельмі прываблівае ненавязлівая падача матэрыялу. Па-другое, яго чыста прафесійная каштоўнасць, бо правільна пісаць — справа гонару прафесійнага журналіста. А ва ўмовах, што склаліся цяпер, большасць рэдакцый пакідае працэс праўкі і выключэння памылак менавіта на журналіста».

**Меркаванні збірала Марына ГУЛЯЕВА**

## ДАПАМОГА БУДУЧЫМ ДЫПЛАМАТАМ

У наш час кантакты з замежжам пышараюцца ва ўсіх сферах: у культуры, палітыцы, навуцы, гандлі... А ўжо студэнтам аддзялення міжнародных адносін гістфака БДУ, як кажуць, самім лёсам прызначана.

З 1993 года дзякуючы ініцыятыве загадчыка кафедры, доктара гістарычных навук, прафесара Шарапы А. В. наладжана супрацоўніцтва з доктарам Іяганесам Шлотцам з кафедры палітычных навук і міжнародных адносін Свабоднага універсітэта горада Берліна.

Аляксандр Віктаравіч адзначыў, што доктар Шлотц аказвае аддзяленню вялікую дапамогу: у прыватнасці, ён перадаў бясплатна літаратуру па знешняй палітыцы, ліберальнай палітыцы на суму большую за 10 тысяч марак, наладзіў абмен студэнтамі. Пры гэтым усе выдаткі на паездкі нашых студэнтаў у Берлін, якія адбываюцца штогадова, узяў на сябе сам доктар Шлотц: праезд, харчаванне, пражыванне.



Нямецкі бок арганізоўвае для беларускіх студэнтаў навучальную праграму на высокім узроўні, добрую культурную праграму. Усе студэнты аддзялення, якія вывучаюць нямецкую мову як першую замежную, пабылі ў Германіі, а 6 студэнтаў 3—4-х курсаў былі там на месяцу на моўнай практыцы.

Досыць часта прыязджаць да нас і нямецкія студэнты: яны былі ў Беларусі па запрашэнню БДУ ўжо тройчы, прычым апошні раз зусім нядаўна — з 30 красавіка па 7 мая.

Сам доктар Шлотц у апошні свой прыезд амаль 3 месяцы бясплатна чытаў лекцыі па палітычнай сістэме ФРГ, знешняй палітыцы аб'яднанай Германіі. Апроч таго Іяганес Шлотц перадаў для аддзялення міжнародных адносін 12 камп'ютэраў IBM-286 і 4 прынтэры да іх. Кафедра, студэнты і прафесура выразілі вялікую сардэчную падзяку доктару Шлотцу за ўвагу і клопат у падрыхтоўцы кадраў маладых беларускіх дыпламатаў. «Нашы студэнты,— зазначыў А. В. Шарапа,— вельмі любяць доктара Шлотца і лічаць яго сваім выкладчыкам».

Сам доктар Іяганес Шлотц пагадзіўся адказаць на некалькі пытанняў для газеты «Беларускі універсітэт».

— Доктар Шлотц, скажыце, калі ласка, наколькі карысна для Вас супрацоўніцтва з аддзяленнем міжнародных адносін гістфака БДУ?

— Мы былі ў Мінску па гэтай лініі ўжо тры разы, вельмі ўдзячныя і задаволеныя. У нас наладжваецца супрацоўніцтва: у лютым у Германіі адбыўся студэнцкі семінар, у якім удзельнічалі беларускія студэнты і нямецкія стыпендыяты фонда Фрыдрыха Наўмана, які я прадстаўляю. Гэта фонд ліберальнай палітыкі, які займаецца распаўсюджваннем знешняй палітыкі.

Увогуле ж нашы студэнты займаюцца праблемамі фашысцкай акупацыі на Беларусі: фашызм і сёння вельмі небяспечны. Важна, што студэнты маюць магчымасць працаваць у архівах, яны адчуваюць небяспеку фашызму — гэта праблема не толькі Германіі, але і іншых краін. Тут студэнты сустракаюцца з тымі, хто бачыў фашызм: партызанамі, падпольшчыкамі...

Мы вельмі ўдзячныя за дапамогу ў рабоце ў архівах старшыні Нацыянальнага камітэта па архівах і справаводству Рэспублікі Беларусь спадару Міхальчэнку. Мы маем магчымасць вывучаць дакументы вайны і нямецкую газету Мінска. Таксама студэнты слухаюць паведамленні работнікаў архіва.

— А якія планы на будучыню ёсць?..

— Нашы студэнты пішуць па архіўных матэрыялах кнігу аб акупацыі Беларусі, рыхтуюць выстаўкі ў Берліне і Мінску.

Асабіста я быў тут ужо больш за 20 разоў. Летам буду працаваць у беларускіх архівах, мая супрацоўніца — ва ўкраінскіх архівах.

Зараз я вярнуся ў Берлін чытаць лекцыі студэнтам, а ў другой палове ліпеня ізноў прыеду ў Мінск...

— Скажыце калі ласка, з кім Вы яшчэ супрацоўнічаеце, апроч БДУ...

— Я перадаваў медыкаменты для медыцынскіх устаноў... Цесныя сувязі ў мяне з Нацыянальнай бібліятэкай, музеем Вялікай Айчыннай вайны, Акадэміяй Навук, з прафесурай іншых устаноў, шэрагам палітыкаў, прэсай, разнастайнымі фондамі, работнікамі мастацтва, культуры і г. д.

**Зміцер ДЗЯДЗЕНКА**

◆◆◆

**НА ФОТАЗДЫМКАХ:**

**У аўдыторыі, абсталяванай камп'ютэрамі.**

**Доктар Іяганес Шлотц і будучыя дыпламаты.**

**А. В. Шарапа і доктар Іяганес Шлотц.**

◆◆◆





# ...АЛЕ НАВОШТА КРЭСЛЫ ЛАМАЦЬ?



**Александр Македонский герой, но зачем же стулья ломать?**

**Из комедии Н. В. Гоголя «Ревизор» (д. 1, явл. 1)**

У падвале аднаго з універсітэцкіх інтэрнатаў вынаходлівыя студэнты зрабілі ход, каб, мінуючы вахту, праводзіць сяброў. Зразумела, каб пакінуць іх на ноч. А збольшага ноччу (вось непрыемнае супадзенне) адбываюцца розныя неверагодныя выпадкі: б'юцца вокны, разраджаюцца вогнетушыцелі, затапляюцца вадой паверхі.

Я не кажу, што гэта робіцца толькі пры дапамозе «пабочных асоб» і што падобнае вынаходніцтва атрымала распаўсюджанне — інакш па студэнцкай «падземцы» можна было б пускаць мінскае метро. Але ж... У інтэрнатах і вучэбных карпусах б'ецца шкло, ламаецца мэбля, высаджваюцца дзверы не залежна ад багацця фантазіі будучых уладальнікаў дыпломаў.

Звышнаіўна спадзявацца, што пасля выхаду артыкула сітуацыя рэзка зменіцца ў лепшы бок. Я разлічваю толькі на тое, што хтосьці са студэнтаў у патрэбны момант проста падумае. А думаць ёсць пра што.

Вялікія сродкі са свайго бюджэту універсітэт траціць не толькі на навучальную і навуковую дзейнасць, але і на гаспадарчую. Ва універсітэце працуе каля 800 чалавек, прафесія якіх непасрэдна не звязана з вучобай ці навукай: сталяры, электрыкі, сантэхнікі, ахоўнікі, вадзіцелі, прыбіральшчыкі і г. д. Без іх таксама немагчыма арганізацыя вучэбнага працэсу.

Толькі вось не хочуць ісці на такую работу: заробак зусім малы, дый адносіны з боку студэнтаў да іх работы не дужа паважлівыя. І ў якасці прыклада гэтых адносін амаль уся адміністрацыйна-гаспадарчая частка прыводзіла мне пафарбаваныя лаўкі ў двары галоўнага корпуса. Маўляў, толькі пафарбавалі, а студэнты іх ужо і затаптаць паспелі — залазяць на спінку, а ногі — на лаўку. А колькі такіх прыкладаў можна прывесці ўвогуле па універсітэту? Асабліва па інтэрнатах.

Аб якой павазе да прыбіральшчыцы (дарэчы штат, як і астатніх рабочых адміністрацыйна-гаспадарчай часткі, укамплектаваны толькі напалову) можна казаць, калі яна штодзённа паўтарае подзвіг Геракла з аўгіевымі стайнямі. А пажарная сігналізацыя, якая зараз увогуле нічым пра сябе не нагадвае, бо яе вынішчылі? А дзверы, ручкі, краны, мэбля... Фінансавання хапае толькі на частку гаспадарчых патрэбаў, а ёсць больш глабальныя праблемы, чым рамонт разламаных сталоў і выбітых дзвярэй.

Многія будынкі універсітэта пабудаваныя ў 50—60-я гады і патрабуюць сёння капітальнага рамонту. У інтэрнатах № 1 і № 7, напрыклад, трэба поўнасцю замяніць электраправодку, сантэхніку, адрамантаваць пакоі, а эксплуатацыю інтэрната № 4 Санэпідэмстанцыя Цэнтральнага раёна ўвогуле дазволіла толькі да 1 верасня 1995 года. Фасады будынкаў біяфака, інтэрнатаў № 2, № 3, № 7 абліцаваныя пліткай, якая з-за няякаснай цэглы адвальваецца і пагражае тым самым не толькі здароўю, але і жыццю людзей. Універсітэцкі гараж, пабудаваны ў 1929 годзе, не адпавядае нормам тэхнічнай бяспекі стаянкі і павінен быць перанесены ў іншае месца. Запасы мэблі, інструментаў, пасцельнай бялізны падышлі да нуля. А на ўсё гэта патрэбны грошы. І немалыя.

Дык можа паспрабуем падтрымаць універсітэт сваімі дзеяннямі (у выпадку шкодных учынкаў, я б сказала, бяздзеяннем). Тым больш, што гэта будзе зусім нястратна.

«Прыходжу я на лекцыю ў зеніце светлавога дня,— узгадвае Ляліна Ганна Міхайлаўна, камендант фізічнага корпуса,— і прашу дазволіць выключыць святло. Калі ласка — чую ў адказ. А самі да гэтага ні выкладчык, ні студэнты, спасцігаючы глыбіні навукі, не дадумаліся». Спадзяёмся, Ганна Міхайлаўна, што гэта было ў апошні раз.

Пры сонечным святле гасіце, калі ласка, электрычныя лямпачкі ва аўдыторыі — гэта не толькі зэканоміць электраэнергію, але і не будзе адмоўна ўздзейнічаць на ваш зрок.

Выходзячы з аўдыторыі, пакоя зачыніце вокны (чалавек разумее, што біць шкло нельга і б'е, а вецер — нават не разумее). А калі ўлічыць, што ва універсітэце 15 навучальных карпусоў, 9 інтэрнатаў і шмат іншых збудаванняў, няцяжка ўявіць наступствы.

Думаю, не мае сэнсу пералічваць усе канкрэтныя сітуацыі, дзе можна праявіць беражлівасць і эканомнасць — вы ведаеце не горш.

Але галоўнае, на што трэба звярнуць увагу і студэнтам і супрацоўнікам — узмацненне выхаваўчай работы па беражлівых адносінах да дзяржаўнай маёмасці.

«Неабходна тэрмінова наладзіць кантакт паміж прафкамам студэнтаў, аддзелам моладзі, студгарадком і факультэтамі і накіроўваць намаганні на ўдасканаленне ўсёй сістэмы выхаваўчай работы. У інтэрнатах адрадзіць (як было 15—20 гадоў таму) студэнцкія Саветы, прызначыць дзяжурных па паверхах, узмацніць прапускны рэжым»,— лічыць прарэктар па адміністрацыйна-гаспадарчай рабоце Тарасевіч Уладзімір Іванавіч.

Напрыклад, сёння студэнты не ведаюць, што акрамя каменданта, кастэляншы і прыбіральшчыцы ёсць у інтэрнатах і выхавацель. І работа яго павінна быць не з «раніцы да абеду», а якраз тады, калі студэнты збіраюцца ўвечары бавіць вольны час. Дыскатэкі не праводзяцца (а калі і праводзяцца, то нелегальна), студэнты прадстаўлены самі сабе. Тут і з'яўляецца цяга «да подзвігаў».

6 красавіка гэтага года на пасяджэнні гарвыканкама прызнаны нездавальняючым стан супроцьпажарнай бяспекі ў ВНУ ўвогуле па гораду. Зафіксаваныя некалькі выпадкаў са смяротным вынікам. Я гэта ўсё да таго, што «подзвігі», акрамя біцця вокнаў і высаджвання дзвярэй, спалучаюцца з пашкоджаннем супроцьпажарнай сістэмы — распыляюцца вогнетушыцелі, знішчаецца сігналізацыя, шкодзяцца супроцьпажарныя рукавы.

«Усё гэта з-за беспакаранасці,— гаворыць галоўны інжынер Краўчанка Валянцін Мікалаевіч, які з'яўляецца адказным па пажарнай бяспецы ва універсітэце.— Студэнты не ведаюць, колькі, напрыклад, сёння каштуе зарадзіць адзін вогнетушыцель або купіць супроцьпажарны рукаў, таму што ўпэўненыя — за іх гэта зробіць універсітэт».

Дый на факультэтах справа складаецца не лепшым чынам: кураць у забароненых месцах: у кабінетах, калідорах, лабараторыях, аўдыторыях. Часта гэта робяць і выкладчыкі, і супрацоўнікі.

Ёсць такое жыццёвае выказванне: «Уратаванне тапельцаў — справа рук саміх тапельцаў». Паверце, што мы ўбачым свой універсітэт прыгожым і ўтульным толькі тады, калі самі захочам гэтага — ні адна прыбіральшчыца не выцягне ўвесь бруд з нашых пакояў, ні адзін вартаўнік не абароніць нас ад саміх сябе.

**Алена ШАЎКУН**

# КАЛЕКТЫЎНЫ ДАГАВОР ПРАФСАЮЗНАГА КАМІТЭТА І АД

## РАЗДЗЕЛ І

### Агульныя палажэнні

1.1. Гэты калектыўны дагавор заключаецца паміж калектывам супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта, які прадстаўлены прафсаюзным камітэтам, і адміністрацыяй універсітэта, якая прадстаўлена рэктарам.

Калектыўны дагавор заключаецца тэрмінам на тры гады і ўступае ў дзеянне з моманту падпісання яго абодвума бакамі. Асноўнымі прынцыпамі заключэння калектыўнага дагавору з'яўляецца сацыяльнае партнёрства і раўнапраўе бакоў.

Прынятыя палажэнні дагавору распаўсюджваюцца на ўсіх членаў калектыву, якія з'яўляюцца членамі прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі.

Адміністрацыя абавязваецца знаёміць з калектыўным дагаворам кожнага, хто паступае на работу. Адміністрацыя і прафкам абавязваецца праз месяц з дня прыняцця дагавору памножыць яго і давесці да ўсіх службаў універсітэта і прафсаюзных арганізацый.

1.2. Адміністрацыя, у асобе рэктарата універсітэта, і прафсаюзны камітэт, у асобе старшыні прафкама, абавязваецца забяспечыць бесперапынны кантроль за выкананнем усіх умоў дагавору.

1.3. Справаздачы аб ходзе выканання калектыўнага дагавору заслухоўваць раз у паўгода на сумесных пасяджэннях рэктарата і прафкама з запрашэннем адказных і зацікаўленых асоб. Справаздачу аб выніках выканання абавязацельстваў за год адміністрацыя і прафкам універсітэта праводзіць на канферэнцыі прадстаўнікоў працоўнага калектыву.

1.4. Адміністрацыя і прафкам абавязваюцца інфармаваць супрацоўнікаў універсітэта аб усіх рашэннях, якія прымаюцца: размеркаванне жылля, фондавага абсталявання, прэміраванне і г. д.

1.5. Бакі абавязваюцца ў выпадку ўзнікнення калектыўных працоўных спрэчак прымаць неабходныя меры для вырашэння іх шляхам перамоў на падставе ўзаемнай павагі і даверу пагаджальным спосабам.

1.6. Рашэнні, прымаемыя канферэнцыяй прадстаўнікоў працоўнага калектыву універсітэта, з'яўляюцца абавязковымі для ўсіх членаў працоўнага калектыву.

1.7. Пры невыкананні палажэнняў калектыўнага дагавору, паўторным парушэнні тэрмінаў выканання абавязацельстваў прафкам, канферэнцыя прадстаўнікоў працоўнага калектыву разглядаюць пытанне аб адпаведнасці займаемай пасадзе адказнага выканаўцы.

1.8. Бакі абавязваюцца стварыць камісію па кантролю за выкананнем калектыўнага дагавору ў колькасці 6-і чалавек: па 3 прадстаўнікі з кожнага боку.

## РАЗДЗЕЛ 2.

### Арганізацыя працы, нарміраванне, аплата працы, заключэнне і скасаванне працоўных дагавораў.

2.1. Распрацаваць і ўвесці ў дзеянне з 1 верасня 1995 года Правілы ўнутранага працоўнага распарадку Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Адк.: Рэктарат, Агульна-прававы аддзел, аддзел кадраў.

2.2. Адміністрацыя універсітэта будзе ажыццяўляць раўнамерную загрузку выкладчыкаў па семестрах, не дапускаць больш 6 аўдыторных гадзін па асноўнай пасадзе, 9 гадзін з улікам сумяшчальніцтва, правядзення не больш аднаго экзамена ў дзень.

Работу ў выхадныя дні дазваляюць у выключных выпадках, афармленне не праводзіць у адпаведнасці з КЗаП па заяве выкладчыка.

Адк.: Рэктарат, дэканы факультэтаў, заг. кафедраў.

2.3. У мэтах паляпшэння ўмоў працы, санітарна-гігіенічнага стану памяшканняў, вучобы студэнтаў, рацыянальнага выкарыстання матэрыяльна-тэхнічнай базы універсітэта перагледзець загад аб замацаванні за факультэтамі і адпаведнымі структурнымі падраздзяленнямі аўдыторнага фонду з улікам аб'ёму і відаў вучэбнай нагрузкі.

Адк.: Вучэбна-метадычнае ўпраўленне, дэканы факультэтаў. Штогод, да верасня.

2.4. Устанавіць аб'ём вучэбнай нагрузкі і разліку на выкладчыка ў сярэднім 700 гадзін, пры тым лекцыйна-семінарская нагрузка павінна быць не менш 130 гадзін. Перавыкананне вучэбнай нагрузкі аплочваць ва ўстаноўленым парадку ў межах пагадзіннага фонду факультэта ці агульнауніверсітэцкай кафедры. Да ўдакладнення сярэдняй вучэбнай нагрузкі вяртацца штогод у верасні з улікам прапаноў вучэбна-метадычнага ўпраўлення.

Адк.: Рэктарат, вучэбна-метадычнае ўпраўленне.

2.5. Дазволіць штатным супрацоўнікам БДУ па ініцыятыве кафедры выкананне пагадзіннай вучэбнай нагрузкі да 0,5 штатнай вучэбнай нагрузкі пры адсутнасці работы па сумяшчальніцтву на іншых пасадах і да 240 гадзін пры наяўнасці работы па сумяшчальніцтву.

Адк.: Дэканы факультэтаў, Вучэбна-метадычнае ўпраўленне.

2.6. Забяспечыць захаванне ўсталяванага парадку і дысцыпліны ўсімі супрацоўнікамі і студэнтамі.

Да студзеня кожнага года распрацоўваць і выдаваць вытворчы каляндар універсітэта на чарговы год.

Адк.: Рэктарат, дэканы факультэтаў. На працягу ўсяго дзеяння дагавору.

2.7. Да 01.09.1995 г. падрыхтаваць і выдаць нарматыўны дакумент аб забароне курэння ў вучэбных карпусах універсітэта.

Адк.: Агульна-прававы аддзел, вучэбна-метадычнае ўпраўленне.

2.8. Захаваць у адпаведнасці з дзеючым палажэннем для прафесарска-выкладчыцкага саставу конкурсны парадак замяшчэння пасад. З асобамі пенсійнага ўзросту, у якіх закончыўся тэрмін выбрання на пасаду, дазволіць адміністрацыі заключаць працоўныя дагаворы на вучэбны год.

Адк.: Аддзел кадраў, дэканы факультэтаў.

2.9. Устанавіць аб'ём аўдыторных вучэбных заняткаў у 1995—1996 навучальным годзе не больш за 36 гадзін у тыдзень.

Адк.: Рэктарат, дэканы факультэтаў.

2.10. Звальненне супрацоўнікаў па скарачэнні колькасці супрацоўнікаў штатаў работнікаў не дапускаецца, калі магчымы перавод з іх згоды на іншыя вакантныя пасады.

Адк.: Аддзел кадраў, агульна-прававы аддзел, кіраўнікі структурных падраздзяленняў.

2.11. Пры скарачэнні колькасці ці штату супрацоўнікаў пераважныя правы ў пакіданні на працы ў выпадку роўнай кваліфікацыі аддаецца (апрача катэгорый, пералічаных у арт. 34 КЗаП) супрацоўнікам, якія з'яўляюцца адзінымі кармільцамі ў сям'і, маюць больш працяглы тэрмін працы ў універсітэце.

Адк.: Аддзел кадраў, кіраўнікі факультэтаў, аддзелаў і службаў.

2.12. Скасаванне працоўнага дагавору па ініцыятыве адміністрацыі па п.п. 1, 2, 5 арт. КЗаП Беларусі праводзіць з папярэдняй згоды прафкама, па п. 3, 4, 7, 8 арт. п. 2, 3, арт. 254 КЗаП РБ — пасля папярэдняга, не раней, чым за два тыдні, паведамлення прафкама.

Адк.: Аддзел кадраў.

2.13. Прадаставіць адміністрацыі права афармлення на работу грамадзян пенсійнага ўзросту на ўмовах тэрміновага дагавору.

Адк.: Рэктарат, старшыня прафкама, аддзел кадраў.

2.14. Пры своечасовым фінансаванні аплату працы праводзіць у адпаведнасці з зацверджанымі стаўкамі і акладамі з 4 па 6 (разлік) і з 16 па 18 (аванс) даты кожнага месяца, а ў выпадку супадзення дат з выхаднымі днямі — у дні, папярэднія выхадным.

Кожны квартал даводзіць да ведама падраздзяленняў аб дэпаніраваных выплатах (сумах).

Выплату стыпендыі студэнтам і аспірантам ажыццяўляць у адпаведнасці з распараджэннямі па факультэтах з 22 па 24 даты кожнага месяца, а ў выпадку супадзення названых дат з выхаднымі днямі — у дні, папярэднія ім.

Выдачу разліковых лістоў ажыццяўляць па ўсіх відах заработнай платы.

Адк.: Галоўны бухгалтар, дэканы факультэтаў, дырэктар ІВЦ.

2.15. Пры недастатковым фінансаванні аплаты працы ў падраздзяленнях навукова-даследчай часткі прадаставіць адміністрацыі права пераводзіць супрацоўнікаў па іх асабістай заяве на няпоўны рабочы дзень, няпоўны рабочы тыдзень, з зарплатай прапарцыянальна адпрацаванаму часу ці прадстаўляць ім адпачынак (неаплочваемы) тэрмінам да 3 месяцаў.

Адк.: Аддзел кадраў, навукова-даследчая частка, галоўны бухгалтар.

2.16. Адміністрацыя і прафкам абавязваюцца адстойваць існуючую рэдакцыю абзаца 7 арт. 34 Закона «Аб адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь».

Адк.: Рэктарат, прафкам, пастаянна.

2.17. Распрацаваць і ўвесці ў дзеянне з 1 кастрычніка 1995 года Палажэнне аб Заслужаным прафесары Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Адк.: Агульна-прававы аддзел, Вучэбна-метадычнае ўпраўленне, аддзел кадраў, планава-фінансавы аддзел, прафкам.

2.18. Распрацаваць у тэрмін да 1 чэрвеня 1995 года і зацвердзіць Прыкладнае палажэнне аб прэміраванні супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага універсітэта.

Адк.: Агульна-прававы аддзел, аддзел кадраў, планава-фінансавы аддзел, бухгалтэрыя, прафкам.

2.19. Распрацаваць у тэрмін да 1 чэрвеня 1995 года і ўвесці ў дзеянне ,Палажэнне аб матэрыяльным заахвочванні супрацоўнікаў універсітэта за распрацоўку вучэбных планаў.

Адк.: Вучэбна-метадычнае ўпраўленне, агульна-прававы аддзел, прафкам.

2.20. Своечасова даводзіць да ведама супрацоўнікаў універсітэта новыя стаўкі заработнай платы, замены ва ўмовах аплаты працы.

Адк.: Аддзел кадраў, планава-фінансавы аддзел.

2.21. Даплаты спецыялістам і служачым могуць устанаўлівацца за сумяшчэнне абавязкаў часова адсутнага супрацоўніка (хвароба, дэкрэтны адпачынак па ўходу за дзіцём да 3-х гадоў, працяглая камандзіроўка) і па рабочых пасадах з аплатай да 100 %.

Адк.: Аддзел кадраў, планава-фінансавы аддзел, агульна-прававы аддзел.

2.22. Запаўненне вакантных пасад уборшчыкаў, дворнікаў, гардэробшчыц можа праводзіцца па сумяшчальніцтву на поўную стаўку.

Адк.: Аддзел кадраў, планава-фінансавы аддзел. Пастаянна.

2.23. Для супрацоўнікаў, якія непасрэдна не ўдзельнічаюць у вучэбным працэсе, усталёўваецца пяцідзённы працоўны тыдзень, які складае 40 гадзін. Пачатак работы з 8.30, заканчэнне ў 17.30. Перапынак на абед — з 13.00 да 14 гадзін. У перадсвяточныя дні працоўны дзень заканчваецца ў 16.30.

Адк.: Аддзел кадраў, агульна-прававы аддзел, аддзел аховы працы і тэхнікі бяспекі.

2.24. Для прафесарска-выкладчыцкага саставу ўсталёўваецца шасцігадзінны працоўны дзень, у межах якога выкладчыкі павінны выконваць усе віды вучэбна-метадычнай і навукова-даследчай работы.

Адк.: дэканы факультэтаў.

2.25. Разглядаць скаргі і канфліктныя сітуацыі і прымаць па іх рашэнні ва ўстаноўлены тэрмін.

Адк.: Прафкам.

2.26. Забяспечыць галоснасць і нагляднасць мераў заахвочвання за добрасумленную працу і дысцыплінарнага

# «Подарил мне нынче ты эти скромные цветы...»

*Падчас летняй сесіі супрацоўнікі газеты «Беларускі універсітэт» звярнуліся да дэканаў факультэтаў толькі з адным пытаннем — «Ці падабаецца Вам, калі студэнты на экзамене дораць кветкі?». І вось якія разнастайныя адказы мы атрымалі.*

**КЛІШЧАНКА АНАТОЛЬ ПЯТРОВІЧ, дэкан фізічнага факультэта:**

— Гэта выдатна і здорава. Аднак выпадкаў, калі студэнты дораць кветкі, стала мала. На жаль, яны не разумеюць, што гэта добра не з пункту гледжання, што адзнакі выкладчык паставіць лепшыя, а таму што зусім іншая атмасфера ствараецца на экзамене.

**ЕЛСУКОЎ АЛЬБЕРТ МІКАЛАЕВІЧ, дэкан філасофска-эканамічнага факультэта:**

— Увогуле падабаецца, аднак я не крыўдую, калі кветкі не дораць. Чаму падабаецца? Гэта знак павагі. Калі на дзяржаўным экзамене ў камісіі адсутнічаюць кветкі, то значыць, што гэтая група проста не падрыхтаваная этычна. Аднак такія выпадкі бываюць.

**ЛАЗОЎСКІ УЛАДЗІМІР МІХАЙЛАВІЧ, намеснік дэкана філалагічнага факультэта:**

— І падабаецца, і лічу, што трэба развіваць гэтую традыцыю. Бо гэта ёсць павага да выкладчыкаў і культура студэнтаў.

**ШУПЛЯК ПЁТР АЛЯКСЕЕВІЧ, дэкан гістарычнага факультэта:**

— Так, безумоўна, падабаецца. Аднак гэта бывае так рэдка і нечакана...

Я і сам люблю дарыць кветкі. Калі мне дораць кветкі, я шчыра дзякую і ў прысутнасці ўсіх тут жа перадаю іх якой-небудзь з маіх студэнтак.

**ЖМОЙДЗЯК РАСЦІСЛАЎ АФАНАСЬЕВІЧ, дэкан геаграфічнага факультэта:**

— Мне падабаецца, калі дораць кветкі. Бо кветкі — гэта заўжды свята. Аднак падчас экзаменаў я не прыхільнік таго, каб дарылі кветкі. Галоўнае на экзамене — веды. Калі добрыя веды, тады і свята.

**БРАНІЦКІ ГЕНАДЗЬ АЛЯКСЕЕВІЧ, дэкан хімічнага факультэта:**

— Для студэнта, які прыходзіць выдатна падрыхтаваны на экзамен, і для выкладчыка, які не сумняваецца ў яго ведах, экзамен — гэта свята. Таму добра, калі на свята дораць кветкі.

**ПРЫМАЧУК ЛЕАНІД ПЛАТОНАВІЧ, дэкан механіка-матэматычнага факультэта:**

— Канешне, падабаецца, аднак апошнім часам мне чамусьці не дораць кветак. Мабыць таму, што экзамен пісьмовы...

**КАРЗЮК ВІКТАР ІВАНАВІЧ, дэкан факультэта прыкладной матэматыкі:**

— Мы, матэматыкі, народ не эмацыйны. Мне ўсё адно — дораць кветкі, не дораць.

**ШУКАНАЎ АДАМ СЯМЁНАВІЧ, дэкан біялагічнага факультэта:**

— Улічваючы эканамічнае становішча, мы вядзём працу, каб студэнты не дарылі кветак. Лепш, калі студэнт адказвае на «выдатна».

**МУЛЯРЧЫК СЦЯПАН РЫГОРАВІЧ, дэкан факультэта радыёфізікі і электронікі:**

— Мне гэтага студэнты не робяць.

**СЛУКА АЛЕГ ГЕОРГІЕВІЧ, дэкан факультэта журналістыкі:**

— Не падабаецца. Самыя лепшыя кветкі — калі ў залікоўцы добрыя адзнакі.




*Сёння, 15 чэрвеня, распачала сваю работу выстава-семінар «Беларусь. Адукацыя-95», якая знаёміць з апошнімі дасягненнямі ў галіне адукацыі, тэхнічнага і праграмнага забеспячэння, папулярызацыяй наватарскіх ідэй, школ, новых напрамкаў у навучанні, прадставіць інфармацыю аб магчымасці навучання за мяжой, наладжванні і развіцці кантактаў з замежнымі партнёрамі, якія спецыялізуюцца на працы ў галіне адукацыі і навукі.*

*Працуе выстава ў галоўным корпусе БДУ (пр-т Ф. Скарыны, 4, пакой 214, тэл.: (0172) 20-70-38, 20-64-69) 15—17 чэрвеня.*

## Паважайце сябе!

Усе ўдзельнікі дарожнага руху: вадзіцелі і пешаходы, — павінны ведаць Правілы дарожнага руху. Няведанне законаў дарог не здымае адказнасці за іх парушэнне.

Пра абавязковае выкананне ПДР забываюць і некаторыя работнікі і студэнты БДУ. Сярод іх студэнты Акуленка В. Л. і Навуменка В. В., якія дагэтуль не навучыліся правільна пераходзіць вуліцу. І чаму работнікі ДАІ павінны ўказваць студэнту Кунаеву Я. А. на адсутнасць талона папярэджання ў вадзіцельскім пасведчанні?

Перавысіў хуткасць руху і студэнт Мікары Шаяр.

Студэнт Шаблакоў А. М. кіраваў аўтамашынай у стане алкагольнага ап'янення.

Нахабства і хамства — адна з рысаў студэнта Пашко А. А., які імчаўся на іншамарцы па дарозе. Для яго язда на чырвоны сігнал святлафора не была парушэннем ПДР. Спыненага парушальніка накіравалі ў ДАІ, дзе затрыманы паводзіў сябе некарэктна.

Паважайце сябе, удзельнікі дарожнага руху! Памятайце: высокая культура ўдзельнікаў дарожнага руху — адна з умоў гарантыі бяспекі на дарогах.

**Старшы дзяржаўтаінспектар Маскоўскага ДАІ**
**В. АДАМОВІЧ**

# ...МІНІСТРАЦЫІ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

ўздзеяння да парушальнікаў працоўнай дысцыпліны, грамадскага парадку.

Адк.: Прафкам, рэктарат. Пастаянна.

### РАЗДЗЕЛ 3

**Паляпшэнне сацыяльна-эканамічных умоў, прадстаўленне ільгот асобным катэгорыям супрацоўнікаў**

3.1. Адміністрацыя і прафкам універсітэта абавязваецца выканаць усю неабходную работу ў 1995 годзе дзеля пачатку будаўніцтва на падставе дагавору дома па вул. Аэрадромнай.

3.2. Прадстаўленне жылой плошчы пры ўмове выдзялення ажыццяўляць у адпаведнасці са спісам чаргі на атрыманне жылля і ільготным спісам супрацоўнікаў.

Пастаноўку на ўлік у чаргу для забеспячэння жылой плошчай ажыццяўляць сумесным рашэннем рэктара і прафкама ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам і нарматыўнымі актамі.

Адк.: Рэктарат, прафкам, дэканаты.

3.3. Супрацоўнік, які аднойчы ўжо атрымаў кватэру ад універсітэта, можа разглядацца паўторна на паляпшэнне жыллёвых умоў толькі ў выпадку перадачы займаемай кватэры універсітэту для паўторнага засялення.

Адк.: Рэктарат, прафкам.

3.4. Па меры фарміравання фонду навукова-тэхнічнага і сацыяльнага развіцця БДУ выдзеліць з гэтага фонду не менш 10 млн. рублёў для частковай аплаты пуцёвак у лагеры аздараўлення дзяцей.

Адк.: Галоўны бухгалтар, старшыня прафкама.

3.5. Аплочваць 1 раз у тры гады са сродкаў сацыяльнага страхавання санаторныя пуцёўкі, якія выдаюцца супрацоўнікам універсітэта, у памеры 90 % ад іх кошту.

Адк.: Галоўны бухгалтар, старшыня прафкама.

3.6. Дазволіць кіраўнікам структурных падраздзяленняў універсітэта ў адпаведнасці з арт. $167^2$ КЗаП Рэспублікі Беларусь прадастаўляць працуючым жанчынам, якія маюць дзяцей ва ўзросце да 16 год, адзін раз у месяц дадатковы выхадны з захаваннем заработнай платы. Штомесячны дадатковы выхадны дзень пераносу на наступны месяц не падлягае.

Адк.: Кіраўнікі структурных падраздзяленняў.

3.7. Жанчынам, якія маюць дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 год, прадастаўляць па іх заяве дадатковы неаплачваемы адпачынак па догляду за дзіцём з захаваннем месца работы (пасады).

Адк.: Аддзел кадраў, агульна-прававы аддзел.

3.8. У адпаведнасці з арт. 76 КЗаП РБ прадаставіць права адміністрацыі даваць неаплочваемы адпачынак працягласцю да аднаго месяца асобам вучэбна-дапаможнага і абслугоўваючага персаналу ў ліпені-жніўні кожнага года.

Адк.: Рэктарат.

3.9. Аказваць супрацоўнікам і студэнтам матэрыяльную дапамогу (з фонду сацыяльнай дапамогі рэктара і прафкама).

Адк.: Рэктарат, старшыні прафкамаў.

3.10. Пры прадстаўленні супрацоўнікам чарговага адпачынку выплочваць дапамогу ў памеры, які залежыць ад памераў эканоміі фонду аплаты працы.

Адк.: Рэктарат.

3.11. Выплочваць аднаразовую дапамогу:

— пры выхадзе супрацоўніка на пенсію па асабістай заяве ў памеры месячнага акладу па займаемай пасадзе, у які ўваходзіць і двухтыднёвая выхадная дапамога;

— сям'і памерлага супрацоўніка, а таксама пры смерці блізкіх сваякоў (бацькі, дзеці) у адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам і ў памеры фінансавых магчымасцей БДУ.

3.12. Забяспечыць умовы для павышэння кваліфікацыі выкладчыкаў і супрацоўнікаў усіх формаў навучання згодна з планамі факультэтаў.

Адк.: Дэканы факультэтаў.

3.13. Павышаць навукова-тэхнічную інфармаванасць прафесарска-выкладчыцкага саставу і студэнтаў універсітэта аб найноўшых дасягненнях навукі і тэхнікі шляхам арганізацыі выстаў у бібліятэцы.

Адк.: Дырэктар бібліятэкі, аддзел навукова-тэхнічнай інфармацыі.

3.14. Садзейнічаць выхаду ў свет заказных манаграфій супрацоўнікаў універсітэта, якія працуюць над доктарскімі дысертацыямі.

Адк.: Рэктарат.

3.15. Камандзіроўкі ў замежныя ВНУ і фірмы (стажыроўка, вучоба) афармляць толькі пры наяўнасці грашовых сродкаў, а для навуковай працы — пры наяўнасці сродкаў па адпаведнай навуковай тэме кафедры на аснове рэкамендацый вучоных саветаў факультэтаў; у выпадку асаблівай тэрміновасці — па рэкамендацыі дэкана з наступным зацвярджэннем на вучоных саветах.

Адк.: Дэканы факультэтаў, начальнік Упраўлення замежных сувязей.

3.16. Па дамоўленасці бакоў адміністрацыя можа прадстаўляць супрацоўнікам дадатковы адпачынак без захавання заработнай платы ў вольны ад заняткаў час тэрмінам ад 3 да 30 каляндарных дзён, у тым ліку ў наступных выпадках:

— уступленне ў шлюб — 3 дні;

— пахаванне блізкіх сваякоў — 3 дні (без уліку дарогі).

Адк.: Рэктарат, прафкам.

3.17. У адпаведнасці з арт. 199 КЗаП Рэспублікі Беларусь супрацоўнікам універсітэта, якія паспяхова спалучаюць працу з вучобай у вячэрніх і завочных ВНУ або ССНУ, прадстаўляюцца мінімальныя ільготы, прадугледжаныя арт. 200-204 КЗаП РБ.

Адк.: Рэктарат, прафкам.

### РАЗДЗЕЛ 4

**Ахова працы, умацаванне здароўя, арганізацыя адпачынку супрацоўнікаў і членаў іх сем'яў**

4.1. Забяспечыць супрацоўнікаў універсітэта, працуючых у шкодных умовах, ільготамі згодна з дзеючым заканадаўствам.

Адк.: Камісія універсітэта, кіраўнікі структурных падраздзяленняў, аддзел аховы працы і ТБ. Пастаянна.

4.2. Забяспечыць бясплатную выдачу малака ўборшчыкам памяшканняў і супрацоўнікам кнігасховішча бібліятэкі пры наяўнасці фінансавых сродкаў на гэтыя мэты.

Адк.: Аддзел аховы працы і ТБ, прафкам. Пастаянна.

4.3. Своечасова праводзіць усе віды інструктажаў па ахове працы і супрацьпажарнай прафілактыцы, рэгулярна праводзіць навучанне і праверку ведаў бяспекі супрацоўнікамі, занятымі на работах з павышанай небяспекай.

Адк.: Аддзел аховы працы і ТБ, кіраўнікі структурных падраздзяленняў.

4.4. Забяспечваць супрацоўнікаў універсітэта спецадзеннем, спецабуткам і мыйнымі і ахоўнымі сродкамі ў адпаведнасці з дзеючымі нарматывамі.

Адк.: Аддзел матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, аддзел аховы працы і тэхнікі бяспекі, кіраўнікі структурных падраздзяленняў.

4.5. Перыядычна праводзіць аналіз паветранага асяроддзя ў памяшканнях універсітэта, даваць ацэнку эфектыўнасці работы вентыляцыйных установак, праводзіць замеры асвятляльнасці рабочых месцаў, тэмпературнага рэжыму ў лабараторыях, аўдыторыях і іншых памяшканнях.

Адк.: Галоўны інжынер, аддзел аховы працы і тэхнікі бяспекі, лабараторыя службы радыяцыйнай бяспекі.

4.6. Асаблівую ўвагу звярнуць на ўмовы арганізацыі працы супрацоўнікаў бібліятэкі, працуючых у кнігасховішчы. Падрыхтаваць да 1 чэрвеня 1995 года хадайніцтва ў Мінадукацыі РБ і Камітэт галіновага прафсаюза аб магчымасці скарачэння на 1 гадзіну працоўнага дня для гэтай катэгорыі супрацоўнікаў з захаваннем аплаты працы.

Адк.: Аддзел аховы працы і ТБ, дырэктар бібліятэкі, прафкам, рэктарат.

4.7. Скараціць да мінімума колькасць вячэрніх заняткаў для выкладчыкаў-жанчын, якія маюць дзяцей школьнага ўзросту, выключыць адпаведныя заняткі для жанчын, якія маюць дзяцей дашкольнага ўзросту.

Адк.: Загадчыкі кафедраў, прафбюро факультэтаў.

4.8. Забяспечыць бесперапынную работу ўсіх кропак грамадскага харчавання (сталовыя, буфеты, кафэ) універсітэта. Дабівацца паляпшэння якаснага прыгатавання страў.

Адк.: Рэктарат, прафкам.

4.9. Аказваць за кошт пазабюджэтных сродкаў фінансавую дапамогу сталовай для арганізацыі грамадскага харчавання студэнтаў і супрацоўнікаў.

Адк.: Рэктарат, прафкам.

4.10. Ажыццяўляць рэгулярны кантроль за работай сталовых, буфетаў і кафэ ў мэтах паляпшэння санітарна-гігіенічных умоў і якасці прыгатавання ежы.

Адк.: Прафкам.

4.11. Забяспечыць адкрыццё з 1 верасня 1995 года на базе стала заказаў фірменнага прадуктовага магазіна ад Аляхновіцкай птушкафабрыкі.

Адкрыць філіялы магазіна на факультэце радыёфізікі і электронікі, геаграфічным факультэце і філалагічным факультэце. Да 1 верасня 1995 года.

Адк.: Рэктарат, прафкам.

4.12. Забяспечыць супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта ільготнымі пуцёўкамі ў санаторыі, дамы адпачынку, пансіянаты. Сумесна з рэктаратам набываць дадатковыя пуцёўкі на лячэнне і адпачынак за кошт фонду сацыяльнага развіцця універсітэта.

Адк.: Прафкам.

4.13. Арганізаваць правядзенне адпачынку выкладчыкаў і супрацоўнікаў і студэнтаў шляхам прадастаўлення пуцёвак, выдаткаваных абкамам прафсаюза на:

— санаторна-курортнае лячэнне;

— адпачынак па пуцёўках міжнароднага турызму;

— адпачынак дзяцей супрацоўнікаў у дзіцячых лагерах:

Адк.: Прафкам.

4.14. Забяспечыць фінансаванне груп здароўя ў адпаведнасці з каштарысам прафкама.

Адк.: Прафкам.

4.15. Адказваць падраздзяленням дапамогу ў арганізацыі экскурсійных паездак па гістарычных і культурных мясцінах, асабліва ў час адпачынку.

Адк.: Прафкам.

4.16. Арганізаваць цэнтралізаванае забеспячэнне білетамі на канцэрты, у кіно і тэатры.

Адк.: Прафкам.

4.17. Праводзіць урачыстыя вечары, прысвечаныя знамянальным датам, тэматычныя вечарыны, творчыя справаздачы народных калектываў, выставы народнай творчасці.

Адк.: Прафкам.

4.18. Удасканальваць сістэму аздараўлення супрацоўнікаў універсітэта. Наладзіць улік чаргі тых, хто мае патрэбу ў лячэнні.

Адк.: Прафкам.

4.19. З улікам экалагічнай абстаноўкі і ў мэтах своечасовага выяўлення захворванняў штогод праводзіць медыцынскую дыягностыку ўсіх супрацоўнікаў універсітэта.

Адк.: Прафкам.

**Рэктар БДУ, акадэмік АН Беларусі**
**Ф. М. КАПУЦКІ,**
**Старшыня прафкама супрацоўнікаў**
**ст. навуковы супрацоўнік**
**А. В. ПАЎЛАЎ.**

